# НАСТРОЙ — НА МАКСІМУМ

**НОВАЯ СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І АЗЕРБАЙДЖАНА НАДАСЦЬ ДАДАТКОВЫ ІМПУЛЬС ПРАЦЭСУ РАЗВІЦЦЯ ДВУХБАКОВАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА**



**Азербайджан заўсёды можа разлічваць на Беларусь, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 лістапада на сустрэчы ў Мінску з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым, паведамляе БЕЛТА. «Мы помнім, як у цяжкі час вы падставілі нам плячо, не аглядваючыся прытым. І калі-небудзь можна ў нюансах гэта ўсё расказаць, як можна вырашаць пытанні дружалюбна на працягу некалькіх дзён, у тым ліку і з вялікімі фінансамі», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Мы заўсёды былі абавязковымі людзьмі. Вы ў гэтым яшчэ раз пераканаліся, — дадаў ён. — Але тым не менш я вам вельмі ўдзячны за падтрымку і дапамогу, асабліва ў цяжкі час».**

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Азербайджану і народу гэтай краіны, каб пры ўсіх нягодах ён быў на вышыні і пераадолеў усялякія цяжкасці, калі ён з імі сутыкнецца. «І ведайце, што тут у вас ёсць сябры», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. Кіраўнік беларускай дзяржавы нагадаў, што ў бакоў усталявалася практыка штогадовага абмену візітамі на вышэйшым узроўні. «Калі мы ўзяліся цесна за беларуска-азербайджанскія адносіны, у нас і тавараабарот пайшоў, зніклі ўсялякія праблемныя палітычныя пытанні, у нас у асабістых адносінах — дай Бог, каб у мяне былі з кожным кіраўніком такія адносіны, — адзначыў беларускі лідар. — Мы настроены, і дамовіліся ў свой час, на максімум».

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што нават у цяжкі час у плане эканомікі дзве краіны захоўваюць тавараабарот на ранейшым узроўні, хоць з іншымі дзяржавамі адбыўся значны спад у гандлі. «Мы зрабілі вялікі зачын, стварылі добры фундамент для нашых адносін», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Ільхаму Аліеву за ўсё тое, што азербайджанскі бок робіць для дзвюх краін, за супрацоўніцтва, якое падтрымліваецца ва ўсіх сферах. «У гэты няпросты для ўсяго свету, а для нас тым больш, час рады вітаць вас у Беларусі. Мне вельмі прыемна, калі вы прыязджаеце, наш аднадумца, мой вялікі сябар, у Беларусі гэта ведаюць, сябар наогул беларускага народа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі і Азербайджана абсалютна няма ніякіх насцярожанасцяў і закрытых тэм.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем заўважыў, што ў цяперашняй няпростай абстаноўцы Беларусь і Азербайджан не дапусцілі прыкметнага зніжэння ўзаемнага тавараабароту. «Тым не менш час патрабуе ад нас хуткіх эфектыўных рашэнняў для нарошчвання эканамічнага ўзаемадзеяння, у тым ліку і на рынках трэціх краін», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што гэтая сустрэча на вышэйшым узроўні надасць дадатковы імпульс працэсу развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, напоўніць яго новым канкрэтным зместам. «Азербайджан быў і застаецца надзейным сябрам і партнёрам Беларусі, — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы высока цэнім нашу дружбу і гатовы гэтак жа шчыра і адкрыта садзейнічаць пашырэнню вашых інтарэсаў у Еўразійскім эканамічным саюзе, калі вам гэта будзе выгадна».

Грамадска-палітычная стабільнасць Беларусі — галоўны паказчык яе поспеху і таксама галоўны залог, што гэты поспех будзе прадоўжаны, заявіў кіраўнік азербайджанскай дзяржавы Ільхам Ілііеў. Паводле яго слоў, у Азербайджане гэтаму вельмі рады. Ён падкрэсліў, што Беларусі ўдалося дабіцца гэтага ў няпросты час. «На эканамічны крызіс у многіх краінах накладаецца крызіс палітычны, у многіх краінах — ваенна-палітычны. Мы жывём у перыяд канфрантацыі, што дыктуе новы падыход да вырашэння міжнародных пытанняў», — адзначыў Прэзідэнт Азербайджана. Для Азербайджана Беларусь — дружалюбная, брацкая дзяржава, сказаў Ільхам Аліеў і выказаў упэўненасць, што пасля гэтага візіту двухбаковыя стасункі будуць развівацца яшчэ хутчэй. У гэтым кантэксце прэзідэнты выказалі цвёрды намер надаць беларуска-азербайджанскім адносінам дадатковую дынаміку. Перш за ўсё гэта датычыцца гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. «Яшчэ раз падкрэсліваю, што паміж Мінскам і Баку няма нявырашаных і невырашальных пытанняў. Закрытых тэм для абмеркавання таксама няма. Мы былі і застаёмся надзейнымі стратэгічнымі партнёрамі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «І нашы азербайджанскія сябры, нашы браты ў Азербайджане павінны ведаць, што ў Беларусі мы ўсё зробім для Азербайджана, на што мы здольныя. Мы заўсёды будзем помніць тую ролю, якую вы адыгралі ў адпаведныя цяжкія часы, падставіўшы нам плячо. Мы гэта добра помнім. І мы ўдзячны, заўсёды будзем гэтак жа падстаўляць сваё плячо азербайджанскаму народу, калі гэта спатрэбіцца», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

# АЙЧЫННАЕ — ЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШАЕ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў вытворчасць у краіне легкавых аўтамабіляў «БелДжы» трэба прыўнесці айчынны вопыт і напрацоўкі**

**Такую задачу ён паставіў на нарадзе па пытанні рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па арганізацыі вытворчасці па зборцы легкавых аўтамабіляў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што праект па стварэнні ў Беларусі легкавых аўтамабіляў з'яўляецца яго даўняй марай. «Мая мара, каб мы мелі не толькі вытворчасць вялікагрузных аўтамабіляў, грузавых, сярэдняй грузападымальнасці, трактароў, але і легкавых аўтамабіляў, каб наша краіна магла забяспечваць патрэбу юрыдычных і фізічных асоб ва ўласных легкавых аўтамабілях», — сказаў ён.

«Зразумела, стварыць самім, з нуля, легкавы аўтамабіль сёння — гэта падобна да смерці. І не для Беларусі гэтая тэма, паколькі і рынак не той, і іншае. Самае галоўнае — многія ж дзяржавы, якія вырабляюць легкавыя аўтамабілі, не проста на гады, на стагоддзі пайшлі наперад. І стварыць легкавы аўтамабіль, а потым канкураваць з гэтымі краінамі, якія вырабляюць сёння тыя ж «Мерседэсы», японскія аўтамабілі, карэйскія і гэтак далей, вельмі складана», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Таму была пастаўлена задача — знайсці краіну, якая гатова нам дапамагчы на аснове іх і нашых тэхналогій стварыць прымальны аўтамабіль, аўтамабіль для нашага народа, каб ён і па якасці, і па цане быў для нас выгадны», — падкрэсліў Прэзідэнт. Такой краінай выступіла Кітайская Народная Рэспубліка. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сёння Кітай па гэтых таварах практычна заваёўвае свет, выпускаючы аўтамабілі добрай якасці. У гэтым пераканаліся і ў Беларусі на прыкладзе аўтамабіля «Джылі», некаторыя кампаненты для зборкі якога пастаўляюцца і беларускім бокам.

«Паглядзеўшы на гэтую зборачную вытворчасць, мы прынялі рашэнне: быць у нас легкаваму аўтамабілю, і стварыць яго мы будзем разам з кітайцамі на аснове іх тэхналогій. Гэта не значыць, што мы проста возьмем, скапіруем і вырабім аналагічны аўтамабіль. Там, дзе можам (а мы можам — вопыт у нас ёсць зборкі і вытворчасці грузавых аўтамабіляў і кампанентаў для легкавых аўтамабіляў), мы павінны выкарыстоўваць уласны вопыт і ўласныя напрацоўкі. Яны ёсць і ў Нацыянальнай акадэміі навук, і ў прыкладной навуцы таксама. Таму пацяху мы павінны ўдасканаліць гэты аўтамабіль і пабудаваць новы завод па вытворчасці так званай «БелДжы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Вядома, мы прымусім калектыў рабіць самыя якасныя аўтамабілі, улічваючы, што тут і вытворчасць, і сэрвіс, і ўлада ўсё ж такі патрабавальная ў краіне. Аўтамабіль будзе добры. Але ёсць жа яшчэ лепшыя аўтамабілі, праўда, па цане вышэйшай. І вось тут як насельніцтва будзе: наш аўтамабіль купляць або, можа, аддасць перавагу няхай дарагой, але ўжо вядомай маркі. Таму першае пытанне — гэта пытанне рынку», — падкрэсліў Прэзідэнт.

■ Кліматычны дыялог

# СКАЗАЦЬ ГЛАБАЛЬНАМУ ПАЦЯПЛЕННЮ «СТОП!»

## Да 2030 года ў нашай краіне плануецца знізіць выкіды парніковых газаў на 28% ад узроўню 1990 года

**Канферэнцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па змяненні клімату распачала сваю працу ўчора ў Парыжы (Францыя). На працягу дванаццаці дзён прадстаўнікі розных краін будуць абмяркоўваць і дапрацоўваць новае міжнароднае кліматычнае пагадненне. Сваю пазіцыю па гэтым пытанні прадставіць і беларуская дэлегацыя.**



— Беларусь падтрымлівае калектыўныя намаганні бакоў Рамачнай Канвенцыі ААН «Аб змяненні клімату» па дасягненні асноўнага арыенціра бягучага стагоддзя — недапушчэння павышэння сярэднесусветнай тэмпературы больш чым на 2°С у адносінах да даіндустрыяльнага перыяду, — расказала **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА.** — У Парыжы наша краіна плануе прадставіць свае магчымыя нацыянальна-вызначаныя ўклады ў гэтыя намаганні і прыняць на сябе абавязацельства забяспечыць да 2030 года скарачэнне выкідаў парніковых газаў не менш як на 28% ад узроўню выкідаў 1990 года без уліку выкідаў і сцёкаў парніковых газаў у сектары «Землекарыстанне, змяненне землекарыстання і лясная гаспадарка».

**Мяркуецца, што міжнародны дагавор у 2020 годзе замяніць дзейны Кіёцкі пратакол, будзе рамачным, установіць агульныя правілы доўгатэрміновых дзеянняў для ўсіх краін.**

### БУДУЧЫНЯ — ЗА НІЗКАВУГЛЯРОДНАЙ ЭКАНОМІКАЙ?

Па словах Іі Малкінай, на долю Беларусі прыпадае менш за 0,01% сусветных выкідаў парніковых газаў. Разам з тым наша краіна выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы па Кіёцкім пратаколе — яна на трэць скараціла выкіды ў параўнанні з 1990 годам пры рэальным росце ВУП за гэты перыяд у два разы.

За 1995-2012 гады вуглеродаёмістасць эканомікі краіны знізілася ў 3,9 раза. Па сутнасці, Беларусь мае адно з самых нізкіх значэнняў вуглеродаёмістасці энергетычнай сістэмы ў Еўропе — каля 0,3 т у эквіваленце $CO_2$ на вытворчасць 1 МВт·г цеплавой і электрычнай энергіі і наблізілася па гэтых паказчыках да такіх краін, як Японія і ЗША.

Паводле новага дакладу ААН аб змяненні клімату, 70% энергіі спажываюць гарады, дзе фарміруецца прыкладна столькі ж выкідаў. І ў наступныя 15 гадоў гарадское насельніцтва ў свеце значна павялічыцца. На думку экспертаў ААН, такая перспектыва павінна стаць штуршком для ўкаранення стратэгіі нізкавугляроднага развіцця гарадоў, паўсюднага выкарыстання энергаэфектыўных тэхналогій і чыстага транспарту.

— Ужо сёння відавочна, што праекты, якія характарызуюцца высокімі ўдзельнымі выкідамі парніковых газаў, паступова адыходзяць на другі план, фінансавыя і інвестыцыйныя структуры перастаюць укладваць у іх грошы, — падкрэсліў **намеснік начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды Андрэй ПІЛІПЧУК.** — У сувязі з гэтым ўсё большая ўвага і фінансавыя рэсурсы будуць накіроўвацца на развіццё аднаўляльных крыніц энергіі — ветру, сонца, біягазу і, магчыма, біямасы.

### ПРЫСТАСАВАЦЦА ДА ЗМЕН ДАПАМОЖА... БІЗНЕС

Акрамя пытанняў скарачэння выкідаў парніковых газаў удзельнікі канферэнцыі разгледзяць таксама і спосабы адаптацыі да змянення клімату і звязаных з ім негатыўных наступстваў, магчымай фінансавай дапамогі краінам, якія развіваюцца.

— Пакуль дакладна не вызначана, якім чынам будзе вырашацца апошняе пытанне, але існуе трэнд, згодна з якім краіны павінны будуць знаходзіць фінансавыя рэсурсы ўнутры сябе, — адзначыў Андрэй Піліпчук. — Напрыклад, прыцягваць бізнес да вырашэння праблем адаптацыі і зніжэння выкідаў парніковых газаў, прымяняць пэўныя заходы (вугляродны падатак) і стымулы для развіцця прамысловасці і нізкавугляродна кірунку.

— Імкнучыся да стварэння экалагічна чыстых умоў, нам трэба разумець, што гэты працэс павінен быць спалучаны са значнымі фінансавымі выдаткамі на развіццё вытворчасці, — падкрэсліла Ія Малкіна. — І толькі тыя экалагічныя нормы і стандарты, выкананне якіх мы будзем патрабаваць ад нашых прадпрыемстваў, дапамогуць дасягнуць спрыяльнага навакольнага асяроддзя.

**Вераніка КАЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

■ Дарэчы

### САМЫ ЦЁПЛЫ ГОД АБЯЦАЮЦЬ СЁЛЕТА

**Спецыялісты адзначаюць, што 2015-ы стане самым цёплым годам за ўсю гісторыю назіранняў за надвор'ем і кліматам, а перыяд 2011-2015 гадоў — самым цёплым пяцігадовым перыядам. Аб гэтым гаворыцца ў інфармацыйным бюлетэні, апублікаваным у Жэневе Сусветнай метэаралагічнай арганізацыяй (СМА).**

У сваім дакуменце навукоўцы паведамляюць, што, паводле прагнозаў, можа быць пераадолены важны сімвалічны парог «перавышэння аналагічнага значэння ў індустрыяльны перыяд на 1 градус». Эксперты СМА тлумачаць гэтую навіну спалучэннем моцнага прыроднага феномену Эль-Ніньё і глабальнага пацяплення, абумоўленага дзейнасцю чалавека. Яны нагадваюць, што перыяд 2011-2015 гадоў суправаджаўся шматлікімі «экстрэмальнымі прыроднымі з'явамі, асабліва хвалямі цяпла, пад уздзеяннем змены клімату».

**Сяргей ПАЛІНІН.**